**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
220004 г. Мінск, праспект Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ДАЗВОЛ
на выкананне навукова-даследчых і праектных работ
на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях
ад 13 мая 2020 г. № 04-01-08/214

Дазвол сапраўдны да 31.12.2020 г.

У адпаведнасці з артыкулам 115 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры дазвол выдадзены ТАА “АФРАНАС”

| | |
|---|---|
| на правядзенне навукова-даследчых і праектных работ | па рэканструкцыі будынка № 40б па вул. Маставой, размешчанага на тэрыторыі |
| матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі “1” | “Гістарычны цэнтр г. Гродна (XII-XX стст.): будынкі і збудаванні, планіровачная структура, ландшафт і культурны пласт”. |

Асобыя ўмовы:

дазвол выдадзены на працяг работ (дазвол ад 13.03.2019 № 04-01-07/142) з улікам справаздачы кіраўніка распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі Шэйко С.Л.;

распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ ажыццяўляць пад кіраўніцтвам грамадзяніна (у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка), які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі (п. 1 артыкула 116 названага Кодэкса);

прымаемыя навукова і метадычна абгрунтаваныя праектныя рашэнні павінны прадугледжваць безумоўнае захаванне адметных вартасцей, што прадугледжана палажэннямі артыкулаў 103, 104 Кодэкса;

праектныя рашэнні прымаць на падставе праекта рэгенерацыі квартала з улікам палажэнняў артыкула 110 Кодэкса і палажэнняў Дэтальнага плана рэгенерацыі забудовы гістарычнага цэнтра г. Гродна” (УП “БелНІІПгорадабудаўніцтва, аб’ект № 66.02);

прадугледзець выкананне комплексу мерапрыемстваў па забеспячэнню ўмоў, неабходных для захавання археалагічных аб’ектаў, у тым ліку правядзення нагляду пры выкананні земляных і будаўнічых работ (артыкул 129 Кодэкса);

праектныя рашэнні, якія могуць прывесці да навукова неабгрунтаваных (не пацверджаных комплекснымі навуковымі даследаваннямі) змяненняў архітэктурнага аблічча гісторыка-культурнай каштоўнасці, пагаршэння візуальных умоў яе ўспрымання і страты адметных вартасцей, не могуць быць узгоднены;

прадставіць навукова-праектную дакументацыю на ўзгадненне ў Міністэрства культуры згодна з артыкулам 119 Кодэкса;

для атрымання дазволу на працяг работ прадставіць у Міністэрства культуры справаздачу аб выкананых работах за папярэдні год, падрыхтаваную асобай, на якую ўскладзены абавязак кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыяй.

Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць катэгорыі “1” – “Гістарычны цэнтр г. Гродна (XII-XX стст.): будынкі і збудаванні, планіровачная структура, ландшафт і культурны пласт” пад шыфрам 411Е000002 уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь згодна з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 у рэд. ад 3 верасня 2008 г. № 1288.

Намеснік Міністра В.І.Грамада

04 Бусько 306 25 01